**Усоўская Э.А.,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

# АСОБА АЎТАРА Ў ПОСТМАДЭРНІСЦКАЙ КУЛЬТУРЫ

Апошнія дзесяцігоддзі XX стагоддзя ўнеслі ў жыццё чалавецтва шэраг змен. Магчыма, адбыўся паварот да іншага тыпу мыслення, іншага светапогляду (у тым ліку і на з'явы сучаснай культуры, якая атрымала характэрную назву "постмадэрнізм", ці "постмадэрн").

Постмадэрнісцкая культура адлюстроўвае своеасаблівы пункт гледжання на асобу аўтара ў працэсе стварэння твора. Аўтар як адзіны творца перастае займаць пануючае становішча. Ён адмаўляецца ад ролі аналітыка, ад пазіцыі рэзюміравання, павучання, што, у сваю чаргу, адкрывае вялікія магчымасці для тлумачэння.

Тлумачэнне — гэта не толькі пашырэнне тэксту. Асабістае ўяўленне пра твор мастацтва ці з'яву культуры, іх ацэнка вылучаюцца на першы план. Твор мастацтва постмадэрнізму набывае "адкрыты" характар, гэта значыць, што ён вольна інтэрпрэтуецца гледачом згодна з асабістым светапоглядам апошняга; суб'ектыўная ж думка аўтара ўжо не мае былога значэння. Так, сучасны беларускі паэт Алесь Разанаў па-свойму трактуе вершы Надзеі Артымовіч, выяўляючы пры гэтым патаемны сэнс сказанага. Нават у сваіх вершаказах і пункцірах адну з'яву ці паняцце ён тлумачыць з пункту гледжання розных культур і моў ("Венік", "Варона"). Можна падумаць так, што, на погляд пісьменніка А.Разанава, вельмі важным з'яўляецца пошук асноў чалавечай думкі, выразнікам якой можа быць душа. Яе стыхія — інтуітыўнае, а не рацыянальнае. Яна, паводле аўтара, нічога "не ўмее" і найпаўней рэалізуецца тады, калі ўяўляе сабой нешта незададзенае, пачуццёвае.

Тэмы вобразаў, з'яў сучаснага абапіраюцца ў творчасці А.Разанава не на адзіны корань-стрыжань, а на цэлую сетку адгалінаванняў мінулага. У выніку творы паэта становяцца адкрытымі для чытача, а той успрымае шэраг паэм, пункціраў, вершаказаў з пункту гледжання свайго пачуцця, асабіста інтэрпрэтуе створанае аўтарам.

Аўтар у постмадэрнісцкай культуры становіцца пасрэднікам, камунікатарам паміж чытачом і культурным тэкстам. Мэта аўтара не ў тым, каб набыць толькі асабістую унікальнасць, своеасаблівасць; парадыгма постмадэрнізму вызначыла ролю мастака ў якасці даследчыка, які шукае, знаходзіць і прапануе аўдыторыі ідэі, каштоўнасці, стэрэатыпы. Па сваёй сутнасці яны не з'яўляюцца новымі. Гэта добра забытае старое, але ў новых умовах яно гучыць па-іншаму.

Пагляд постмадэрнісцкага аўтара накіраваны ў мінулае з мэтай пераасэнсаваць спадчыну чалавечай цывілізацыі. Функцыя аўтара заключаецца ў тым, каб "перакладаць" узнікаючыя каштоўнасці на мову спажыўца, каб публіка магла разам з аўтарам ствараць тэкст. Аднак гэта не значыць, што аўтар пазбаўляецца магчымасці мець асабістую індывідуальнасць. Яго "почырк" захоўваецца і высвятляецца ў момантах гульні і інтэрпрэтацыі. З дапамогай аўтара, які з'яўляецца прадуктам сваёй эпохі, чытач можа некаторыя з'явы, моманты жыцця вылучыць для сябе як значныя ці, наадварот, адхіліць іх.

Напрыклад, Сяргей Даўлатаў у сваіх навелах, у прыватнасці ў "Кампрамісах", разгортвае ў полі зроку спажыўца цэлую мазаіку вобразаў, з'яў, значэнняў. Перад намі паўстае неардынарная асоба Эрыка Буша, схільнага кахаць жанчыну гэтак званага "бальзакаўскага" ўзросту, што не перашкаджае герою страсна "паважаць" алкаголь, а таксама займацца пошукам "праўды жыцця". Не менш каларытны і вобраз Мішы Жбанкова. Фатограф, што называецца, "ад бога" растрачвае свой талент па дробязях — яго здольнасці аказваюцца не запатрабаванымі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

грамадствам. С.Даўлатаў не асуджае і не падтрымлівае ўчынкі дзеючых асоб, а адкрывае чытачу абсяг для роздуму на тэмы праблем рэалізаванасці асобы, месца чалавека ў грамадстве, адносін паміж уладай і індывідам. Той, хто валодае здольнасцю да рэфлексіі, на працягу знаёмства з аповесцю ўзнімае шэраг пытанняў, на якія сам жа спрабуе адказаць, зрабіць пэўныя вывады. С.Даўлатаў, які выконвае ролю апавядальніка, дае магчымасць чытачу прыняць ці адмовіць ідэі, каштоўнасці, думкі, прапанаваныя аўтарам ці дзеючымі асобамі.

Мастак (аўтар) у постмадэрнісцкай культуры больш не можа быць адзіным вытворцам перш-наперш таму, што ён ніколі не працуе з "чыстым" матэрыялам.Твор аўтара не з'яўляецца першасным. Ён існуе як сетка алюзій на іншыя творы. Постмадэрнісцкі тэкст уяўляе сабой не гатовы твор, а працэс узаемадзеяння пісьменніка з тэкстам, прычым такога ўзаемадзеяння, якое прыводзіць да нараджэння тэксту літаральна на вачах чытача. Такім чынам узнікае шматмерны нелінейны тэкст, інтэртэкст. Ён прынцыпова адкрыты для новых элементаў. Умоўна постмадэрнісцкі тэкст уяўляе сабой перакрыжаванне сацыякультурных дыскурсаў і ўключае стылістычныя катэгорыі постмадэрнісцкай культуры, падзеленыя паміж пісьменнікам і тэкстам каштоўнасці і фігуру аўтара. Асоба аўтара разам з гэтымі сумеснымі каштоўнасцямі выконвае камунікатыўную функцыю, як бы дапамагае знайсці агульныя пункты ўзаемаразумення. Постмадэрнісцкая культура прапануе ў якасці галоўнай з сумесных каштоўнасцей стаўленне да чалавека як да асобы, што валодае асабістым светапоглядам, меркаваннем. Апошнія разам з катэгорыямі постмадэрнісцкай культуры (рызомай, паспарту, дыферансам, дэканструкцыяй) дапамагаюць змястоўна інтэрпрэтаваць тэкст такім чынам, каб ён стаў зразумелым для спажыўца з пункту гледжання яго асабістага сэнсу.

Прыкладам узаемаадносін паміж катэгорыямі постмадэрнісцкай культуры, сумеснымі каштоўнасцямі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асобай аўтара і аўдыторыяй можа служыць кінастужка Роберта Земекіса "Хто падставіў труса Роджэра?" Перад гледачамі паўстае незвычайнае спалучэнне мультыплікацыі з выразным дзеяннем, гульнёй акцёраў. Сюжэт, на першы погляд, вельмі просты. Прыватны дэтэктыў Эдзі Вэльент дапамагае "мульцяшцы", трусу Роджэру, даказаць яго недатычнасць да забойства Марвіна Акмэ, уладальніка кінастудыі па вытворчасці мультфільмаў. У той жа час аўтар, Земекіс, незаўважна "падштурхоўвае" гледача да гульні, іроніі, інтэрпрэтацыі, насычае апавяданне мноствам цытат, спасылак, запазычанняў. З лёгкасцю ўспрымаецца тое, што адбываецца на экране. Аднак кожная цытата і спасылка патрабуюць ад гледача пошуку першапачатковага сэнсу, крыніцы сказанага. І хутка становіцца відавочна, што дэтэктыўны сюжэт з'яўляецца тут смешным, цікавым парафразам на тэмы трылераў і "чорных" фільмаў 40-х гадоў. Злодзей-пракурор з "гаворачым" прозвішчам Дум (Рок) перайшоў з коміксаў. А спецыяльна прыдуманы забаўны адчайны трус Роджэр — больш камічны варыянт Багза Бані з вядомага мультсерыяла "Уорнэр Бразэрс". Тыя, хто жадае, могуць знайсці перакліканне шэрага сцэн (напрыклад, фінальнага паядынку з пракурорам Думам) з некаторымі сучаснымі "крутымі" баевікамі.

Такім чынам, карціна, пабудаваная на "законах" постмадэрнізму, уключае асноўныя моманты стылістычных катэгорый дадзенай культуры. Тым не менш самастойна гульня, іронія, цытатнасць, бясконцасць пераходаў і камбінацый існаваць не змаглі б. Аўтар Роберт Земекіс незаўважна прысутнічае і "пастаўляе" гледачу вобразы, характары і якасці герояў, разнастайную гаму іх учынкаў і перажыванняў; ён з'яўляецца тым самым перакладчыкам і пасрэднікам паміж аўдыторыяй і рэжысёрам. Па-свойму інтэрпрэтуючы задуму мастака, гледачы выбіраюць з прапанаванага тое, што для іх цікава. Пры гэтым у фільме ўлоўліваюцца спачатку контуры, а потым больш пэўныя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рысы каштоўнасцей, якія аказваюцца агульнымі як для гледачоў, так і для стваральнікаў карціны. У дадзеным выпадку сумеснымі каштоўнасцямі могуць з'яўляцца імкненне да справядлівасці, спачуванне лагоднаму трусу Роджэру, пацеха гумарам, добрай ironiяй і г.д.

Такім чынам, аўтар не цэнтр, вакол якога ўсё канцэнтруецца, а толькі пасрэднік, медыятар. Ён не выключны вытворца, а своеасаблівы прынцып, крыніца сэнсу. Галоўнае заключаецца ў тым, каб аўтар не навязваў асабісты пункт гледжання спажыўцу, каб аўтарскія высновы не прыглушалі індывідуальнае бачанне чытача. Урэшце сам мастак-пісьменнік постмадэрнісцкай культуры імкнецца "растварыцца" ў тэксце, выказаць сябе праз герояў, праз каментарыі да сказанага. Асноўнае прызначэнне аўтара — ствараць жыццё ў яго разнастайных формах, ствараць "версіі", гульні. Функцыя аўтара, з пункту гледжання постмадэрнізму, заключаецца ў перакладзе бясконцасці сэнсаў у плоскасць успрымання чытача.

Аўтар як фігура выключнага вытворцы (але не сам аўтар) адыходзіць, калі роля яго выканана, калі тое, што было ім узята з тэксту як перакрыжаванне сацыякультурных дыскурсаў, "трапляе" на вочы спажыўца. Тады пачынаецца працэс фарміравання інтэртэксту — складанага, нелінейнага тэксту, які адкрыты для самых розных дадаткаў. Аўтар-камунікатар, такім чынам, павінен ведаць, што ён не мае права ўстанаўліваць ніякіх стандартаў, што да чытача неабходна ставіцца як да індывіда-вытворцы з яго асабістым успрыманнем, светапоглядам і ніколі не зыходзіць з перавагі сваіх перакананняў над перакананнямі і поглядамі спажыўца. Трэба разумець, што кожны чытач можа прапанаваць нешта асабістае, нешта не менш змястоўнае. Роля аўтара-медыятара ў постмадэрнісцкай культуры дэманструе, што разам з ім (а можа, і ў большай ступені) тэкст стварае чытач. Важнае месца ў гэтым працэсе займаюць інтэр-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прэтацыйныя значэнні, а таксама розныя-плюралістычныя мадэлі культуры.

**Сцяпанава А.В.,**
*аспірантка кафедры*
*сацыялогіі і культуразнаўства*

## РЫСЫ ПОСТМАДЭРНІЗМУ Ў ТВОРАХ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА
### (на матэрыяле рамана У.Караткевіча "Хрыстос прызямліўся ў Гародні")

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Цяжка гаварыць пра тое, што любіш",— пісаў у адным са сваіх эсэ У.Караткевіч. Цяжка, бо трэба перадаць у слове тое, што даўно стала часткай цябе і асобна ўжо амаль не ўспрымаецца. Так і з творамі У.Караткевіча. Пазнаеш іх па аўтарскім стылі, які збліжае прыгодніцкую рамантыку і жорсткую праўдзівасць гісторыі і ў якім дасціпны гумар не псуе ўражання чытачу-эстэту, захопленаму інтэлектуальнай гульнёй. Мы знаёмімся з гэтымі творамі па школьным курсе беларускай літаратуры, бачым іх на тэле-, кінаэкранах. Магчыма, дзякуючы ім у кагосьці пачынаецца захапленне гісторыяй або літаратурай. Мы любім У.Караткевіча. Але часта пазнавальнасць вядзе да прывыкання, мы губляем чысціню і вастрыню пачуццяў.

Таму, відаць, прапанаваны падыход да творчасці беларускага пісьменніка будзе нязвыклым для прыхільнікаў традыцыйнага літаратуразнаўства. Прадставім тут гэты падыход як распрацоўку ідэі, што з'явілася ў час роздуму над некаторымі праблемамі сучаснай культуралогіі.

Словам "постмадэрнізм" (літаральна "тое, што пасля мадэрна, сучаснасці") прынята акрэсліваць некаторыя тэндэнцыі развіцця культуры апошніх дзесяцігоддзяў. У культуралагічным сэнсе таму немэтазгодна